# "Веснаход" у Траецкім



"Ноч музеяў" у Літаратурным музеі М. Багдановіча прайшла пад знакам вясновай, поўнай прагі зменаў танальнасці. У межах акцыі "Веснаход" адбылася прэзентацыя мастацка-дакументальнай выстаўкі "Максім Багдановіч і Зоська Верас. Нечужыя людзі...", якую адкрыла загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела музея Ірына Мушкавец. Галоўным экспанатам выстаўкі стаў невялікі лісток, напісаны Максімам да Людвікі пад час гульні ў "пошту". Дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіву-музея літаратуры і мастацтва Ганна Запартыка выказала ўпэўненасць, што адрамантаваныя залы музея М. Багдановіча ўбачаць яшчэ не адну выставу, наладжаную сумеснымі намаганнямі двух установ. Адкрыццё выставы прайшло пад цікавую музычна-танцавальную праграму, прадстаўленую этнасуполкай пад кіраўніцтвам Таццяны Пладуновай з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва.



Пры падтрымцы цэнтра японскай культуры ў Менску гасцям свята была прадстаўлена магчымасць пачуць М. Багдановіча ў перакладзе на японскую мову і бліжэй пазнаёміцца з культурай Японіі.

На працягу вечара дарослыя разам з дзеткамі маглі паўдзельнічаць у інтэрактыўных праграмах "Дотык траўня" і "Фарбы траўня": ажыццявіць падарожжа ў чароўны свет вобразаў Максіма Багдановіча, памаляваць крэйдай на пляцоўцы каля музея, упрыгожыць сябе бодзі-арт





малюнкам, зрабіць на памяць вясновую аплікацыю.

Завяршылася "Ноч музеяў" канцэртнай праграмай "Навальніца вясны".

***Мікола Ліннік,***
*г. Менск.*

**На здымках:**

1. Валошка ад Ганны Запартыкі..

2. М. Тацумі выконвае пераклад вершаў М. Багдановіча (здымак Э. Олінай).

3. Запіска М. Багдановіча да Зоські Верас.

4. Прамаўляе Ірына Мушкавец.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ